джэння Герольдыяй. У 1842 праведзена новая рэвізія ў зах. губернях аднадворцаў, грамадзян і іудзеяў. Паводле ўказа ад 17.3.1847 шляхта, якая не прадставіла ў тэрмін пасямейных спісаў, запісвалася ў дзярж. сяляне, а тыя, што падалі — у аднадворцы і грамадзяне. Але практычна гэта не было зроблена. Асобы, не зацверджаныя ў дваранстве, паводле закона ад 23.1.1847 пазбаўляліся права купляць зямлю з сялянамі. Указам ад 1.8.1857 шляхціцы, якія да гэтага часу не былі зацверджаны ў дваранстве і прапусцілі тэрмін для запісу ў аклад, былі падзелены паміж некалькімі станамі. Асобы, якія валодалі зямлёй, аднесены да сялян-уласнікаў; а тыя, што валодалі зямлёй у дзярж. вёсках,— да дзярж. сялян; асоб, якія жылі на памешчыцкай зямлі, запісвалі вольнымі людзьмі. У рэвізіі 1858 яны фігуруюць як вольныя хлебаробы, хоць такі стан юрыдычна ўжо не існаваў (скасаваны ў 1848). Неаселых шляхціцаў запісвалі на выбар у сяляне або ў гар. станы, акрамя грамадзян. Фактычна ўсе былі запісаны ў стан мяшчан. Гэты закон не закранаў шляхту, якая раней была запісана ў якасці аднадворцаў і грамадзян.

Пасля *паўстання 1863—64* уведзены новыя абмежаванні ў прынцыпах доказу і атрымання дваранства. Указ 10.12.1865 забараніў «палякам», г.зн. католікам, набываць маёнткі. Указам ад 19.1.1866 усе шляхціцы, якія не даказалі свайго дваранства, уключаны ў склад сялян ці мяшчан. Станы аднадворцаў і грамадзянаў зах. губерняў скасаваны паводле закона ад 19.2.1868. Аднадворцы былі прылічаны да сялян, а грамадзянам даваўся год на выбар прыпісацца да сялян або мяшчан. Гэта быў канчатковы акт юрыд. скасавання шляхецкага стану б. ВКЛ. Хоць юрыдычна адбылася поўная уніфікацыя саслоўяў у Беларусі з іншай тэр. Рас. імперыі, але ў многіх установах дзярж. кіравання, найперш у казённых палатах, працягваўся статыстычны ўлік і кантроль за «былой польскай шляхтай». Працягвалі дзейнічаць абмежаванні на набыццё зямлі. Толькі ўказам ад 4.3.1899 дазволена дваранам і мяшчанам католікам, якія асабіста займаліся земляробствам, купляць зямлю, але каб агульная колькасць яе не перавышала 60 дзесяцін. Пасля рэвалюцыі 1905 указам ад 1.5.1905 католікам дазволена купляць зямельную ўласнасць, але толькі ў католікаў; набыццё зямлі ў асоб інш. веравызнання абмяжоўвалася 60 дзесяцінамі і інш. ўмовамі. Гэтыя абмежаванні захаваліся да канца існавання Рас. імперыі.

*Літ.*: Неупокоев В.И. Преобразование беспоместной шляхты в Литве в податное сословие однодворцев и граждан: (Вторая треть XIX в.) // Революционная ситуация в России в 1859—1861 гг. М., 1974. Т. 6; Rychlikowa I. Carat wobec polskiej szlachty na ziemiach zabranych w latach 1772—1831 // Kwartalnik historyczny. 1991. № 3.

*Уладзіслаў Вяроўкін-Шэлюта.*

**РАЗВАДОВА**, гл. ў арт. *Баранавічы.*

**РАЗВАДОЎСКІ** Канстанцін Іванавіч [1814—23.3(4.4).1885], расійскі ваенны




дзеяч, граф (1872). Ген. ад інфантэрыі. З дваран Мінскай губ. З 1829 у лейб-гвардыі Літоўскім палку, з 1845 у Неўскім марскім палку на Каўказе. Удзельнік ліквідацыі *паўстання 1830—31* і Венгерскай рэвалюцыі 1848—49, Крымскай вайны 1853—56. У час *паўстання 1863—64* камандаваў войскамі Замкавага напрамку г. Варшавы, потым старшыня асобай следчай камісіі па паліт. справах у Царстве Польскім. У 1864—67 генерал для асобых даручэнняў пры намесніку Царства Польскага. З 1867 камендант Варшавы. *Андрэй Лукашэвіч.*

**«РАЗДАВІМ ФАШЫСЦКУЮ ГАДЗІНУ»**, сатырычны агітплакат да сак. 1942, пазней газета-плакат, сатырычны часопіс ЦК КП(б)Б для насельніцтва і партызан Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Выходзіў з ліп. 1941 да мая 1945, спачатку на рус., з сак. 1942 на бел. мовах. Выдаваўся ў Гомелі, потым у прыфрантавой паласе і ў Маскве, пасля ў Навабеліцы (цяпер у межах Гомеля) і Мінску. Змяшчаў фельетоны, памфлеты, сатыр. вершаваныя і празаічныя літ. творы, карыкатуры. У выданні друкаваліся творы Я.Коласа, Я.Купалы, А.Астрэйкі, П.Броўкі, Я.Брыля, В.Віткі, К.Крапівы, М.Лужаніна, П.Панчанкі, М.Танка, М.Чавускага, К.Чорнага і інш. пісьменнікаў, малюнкі І.Ахрэмчыка, Л.Брадатага, В.Букатага, К.Елісеева і інш. мастакоў. Сродкамі сатыры і гумару выданне высмейвала акупантаў і іх памагатых, заклікала да актыўнай барацьбы з ворагам. Са жн. 1945 выходзіць як сатырычна-гумарыстычны час. *«Вожык».*



**Разец**: 1 — вуглавы, 2 — бакавы.

**РАЗЕНТАЛЬ** Карл Фёдаравіч (1890, Рыга — 15.11.1983), савецкі дзярж. дзеяч. Скончыў рэальнае вучылішча ў Дзвінску (цяпер г. Даўгаўпілс, Латвія) і курсы тэхн. сувязі. З сак. 1917 па сак. 1918 нам. старшыні, старшыня Слуцкага Савета рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў. У жн. 1918 акруговы камісар Смаленскай паштова-тэлеграфнай акругі, у снеж. 1918 — камісар пошт і тэлеграфаў Зах. вобл. У студз.—жн. 1919 нарком пошт і тэлеграфаў БССР, ЛітБел. З ліст. 1920 нач. упраўлення сувязі Туркестанскага фронту. З 1921 у Туркестанскай АССР, Узбекскай ССР. З 1930 вучоны сакратар прэзідыума ВСНГ СССР. З 1931 чл. прэзідыума Дзяржплана СССР. У 1939 — 51 на буд-ве абарончых аб'ектаў «Галоўпрамбуда» МУС СССР. *Эмануіл Іофе.*

**РАЗЕЦ**, востраканцовая прылада з пласціны або адшчэпу крэменю, прызначаная для разьбы, гравіроўкі, выразання пазоў і расчлянення косці, рогу, дрэва. Рабочая частка звычайна ў форме двухграннага вугла, утварае пры перасячэнні граней вузкі кант, які нясе асн. функцыянальную нагрузку. У залежнасці ад спосабу падрыхтоўкі рабочай часткі вылучаюць асн. тыпы Р.: на вугле зламанай загатоўкі; рэтушныя, ці бакавыя; двухгранныя, ці сярэдзінныя. Былі шырока распаўсюджаны ў эпоху позняга палеаліту. На тэр. Беларусі існавалі на працягу каменнага веку.

*Літ.*: Орудия каменного века. Киев, 1978.

*Віктар Кудраиоў.*

**РАЗНАЧЫНЦЫ** («людзі рознага чыну і звання»), міжсаслоўная катэгорыя насельніцтва ў Рас. імперыі ў канцы 18—19 ст., выхадцы з розных саслоўяў (духавенства, купецтва, мяшчанства, дробнага чыноўніцтва і г.д.); юрыдычна не аформленая катэгорыя насельніцтва, якая займалася пераважна разумовай працай. Да Р. належалі Ф.*Савіч*, К.*Каліноўскі*, І.*Грынявіцкі* і інш.

**РАЗУМОЎСКАЯ** (Арасімовіч) Любоў Вячаславаўна (1897, г. Бельск Гродзенскай губ., цяпер у Падляскім ваяв., Польшча — 1969), гісторык-славіст, філолаг. Д-р гіст. н. (1960). Скончыла гіст.-філал. курсы ў Казані (1918), удасканальвала адукацыю ў Петраградскім ун-це (1921). З 1923 супрацоўнік Славянскага аддзялення 6-кі АН СССР у Петраградзе. У 1929—35 выкладчыца польскай мовы, гіст. граматыкі і дыялекталогіі ў пед. ін-це імя Герцэна. З 1935 у Ін-це кнігі АН СССР, з 1945 у Ленінградскім ун-це. З 1961 супрацоўнік Ін-та славяназнаўства АН СССР. Даследавала гаворкі Бельскага пав., гісторыю польскага, бел. і ўкр. сялянства ў сярэднявеччы. Адзін з аўтараў «Гісторыі Польшчы» (т. 1, 2-е выд., 1956).